**Дзяржаўная ўстанова адукацыі**

**“ Даўгінаўская сярэдняя школа імя У.І.Слабодчыкава”**

# *Множанне і дзяленне соцень на адназначны лік*








**Настаўнік-дэфектолаг**

**Цімашчук Н.А.**

**Тэма :** Множанне і дзяленне соцен на адназначны лік

**Мэта** 1) замацаванне ў вучня ўмення множыць і дзяліць сотні на адназначны лік;

2)развіццё вылічальных навыкаў,самастойнасці ў выкананні заданняў;прасторавага арыентавання,узнаўлення пройдзенага матэрыялу,слоўнікавага запасу;

3)выхаванне ўпэўненасці ў сабе,павагі да акружаючых,любові да Айчыны.

**Форма правядзення: гульня "Зарніца"**

**Абсталяванне** : сшытак,падручнік,карткі з заданнямі,карта мясцовасці ,медалі , музычнае суправаджэнне фізхвілінкі.

**Ход занятка**

**I.Арганізацыйны момант**

Н.,-Добры дзень,паважаныя госці.

В.,-Добры дзень.

Н.,-Празвінеў ужо званок,пачынаем наш урок.Сядай,калі ласка,Валера ,за парту.

Кажуць,што за 1 мінуту чалавек можа зрабіць 1 добрую справу,за 10 мінут – 10. А колькі добрых спраў можа зрабіць чалавек за 45 мінут?

Н.,-Прачытай,выказванне,якое запісана на дошцы:

***Калі за ўрок ты не атрымаў ніякіх ведаў,***

***значыць гэты ўрок прайшоў для цябе дарэмна!***

-Што ты адкажаш на гэта?

В..-Сёння на ўроку матэматыкі я буду старацца добра лічыць,рашаць,запамінаць,каб урок не прайшоў дарэмна.

Н.,-Сённяшні ўрок у нас незвычайны. Ты ўжо здагадаўся па тым,калі я папрасіла цябе апрануцца па ваеннаму.Паглядзі на дошку і адкажы,якое свята мы адзначалі нядаўна? (малюнак да дня абаронцы Айчыны)

Калі ласка зачытай,каго віншуюць з гэтым святам(вучань чытае)

***У нас прынята віншаваць з гэтым святам усіх мужчын і нават хлопчыкаў.Бо кожны мужчына можа стаць абаронцам Айчыны,калі будзе неабходнасць.Напрыклад,калі здарыцца вайна або стыхійнае бедства.Калі будзе пагражаць небяспека слабым і безабаронным,жанчынам, старым і дзецям,любы сапраўдны мужчына стане іх абаронцам.А значыць,будзе абараняць сваю Радзіму.***

Дзякуй,Валера, А зараз мы вернемся да нашага ўрока матэматыкі і правядзём яго у форме гульні "Зарніца".Ты ведаеш што-небудзь пра гэтую гульню? Канешне,такіх спаборніцтв, як у сапраўднай гульні мы не абяцаем ,але гульнёвыя элементы вядомай усім ваенна-спартыўнай гульні выкарыстаем на сённяшнім уроку.

Тэма нашай гульні матэматычная " **Множанне і дзяленне соцен на адназначны лік.** (запіс на дошцы)

Камандзірам у атрадзе буду я,як старэйшая.У мяне нават ёсць генеральскія пагоны.І паколькі ты адзін ,то табе прыйдзецца пабываць у розных ролях. У нас ёсць карта мясцовасці з заданнямі.Выканаеш заданне правільна -атрымаеш медаль.

**II. Актуалізацыя ведаў**

І так слухаем маю каманду

Знаходзім заданне пад нумарам 1.Устаць ,направа, 1 крок уперад ,налева,тры крокі ўперад.

В.,Ёсць. ***"Меткі снайпер"***

-***Слоўнікавая работа***-*снайпер ,чалавек ваеннай прафесіі, які страляе ў цэль без промаху,метка*

*Н.,* -Гэта матэматычная размінка.Я задаю пытанні , а ты адказваеш вусна.Мішэнь складаецца з 10 кругоў.Калі ты адказваеш правільна,нумар адказа памяшчаецца ў цэнтр – у дзясятачку,а калі адказ не правільны –у круг пад нумарам1.

Увага!

Н.,-Колькі паверхаў у нашай школе?

1.Колькі месяцаў у годзе?

2.Колькі дзясяткаў у ліку 20?

3.Колькі дзясяткаў у ліку 45?

4.Коькі соцен у ліку 800?

5. Назаві любы трохзначны лік.

6. Назаві любы двухзначны лік.

7.Колькі дзясяткаў у ліку 500?

8.Колькі дзясяткаў у ліку 180?

9.Колькі дзясяткаў у ліку 450?

10.7 дзясяткаў,колькі гэта адзінак?

Н.,-Маладзец,ты справіўся з заданнем.Атрымай медаль “Лепшаму снайперу”.Сядай.

**II.<u>Асноўная частка</u>**

2.Знаходзім заданне пад нумарам 2.Устаць,направа,1 крок уперад,налева,2 крокі уперад,направа.

В.,-Ёсць**.”Прайдзі праз балота””**

Чытай заданне.

В.,-Выканаць множанне і дзяленне.Выканаць самаправерку.

(картка ў выглядзе балота:камышы і купіны -на купінах прыклады.Балота замініравана.Твая задача-размініраваць балота і даць атраду дарогу .Ты выступаеш у ролі сапёра *.Хто такі сапёр?*

***<u>Слоўнікавая работа</u>*****:** сапёр – ваеннаслужачы, які прафесіянальна можа ачысціць ад мін паверхню з дапамогай прыбора ,які падае сігнал. А яшчэ дапамагае адшукваць міны дрэсіраваны сабака.

| | | | |
|---|---|---|---|
| 300 х 2= | 200 х 3= | 900 : 3= | 800 : 4= |
| 300 : 3= | 100 : 1 = | 600 х 1= | 180 : 3= |

Маладзец.Атрымай медаль **"Лепшы сапёр"**

3.Знаходзім заданне пад нумарам 3.Устаць,направа,5 крокаў уперад.

Ёсць.**"Наладзь сувязь"**

Н.,Хто наладжвае сувязь?

В.,-Сувязіст.

У атрадзе атрымана тэлефанаграма з вельмі важнымі звесткамі аб ворагу.Але яна зашыфравана і чамусьці адсутнічае сувязь.Сувязіст Валера,вам неабходна хутка наладзіць сувязь і расшыфраваць тэлефанаграму.

В.,-Скласці выраз і рашыць яго

Н.,-Прыступай і помні,што ты заўсёды можаш звярнуцца за дапамогай да мяне ,паколькі я твой камандзір і памочнік.

( 731- 331) : 2=

Праверка задання(настаўнік на дошцы рашае выраз з памылкай ,вучань знаходзіць памылку і даказвае правільнасць свайго рашэння)

III.Фізхвілінка.

-А зараз я аб'яўляю **"Прывал"** (гучыць песня "Идёт солдат по городу»)

**IV.** Ітак , мы знаходзімся на правільным шляху.Мне вельмі хочацца ,каб генеральскія пагоны перайшлі да цябе. Застаецца вельмі важнае заданне.Паглядзі,картка з якім заданнем стаіць у цябе на стале?

В.-"Даслужыцца да генерала"

Рашыць задачы ст.158 № 3

Вучань працуе з падручнікам і рашае задачы

Н.,-Маладзец.Ты справіўся з задачамі.І я перадаю табе свае генеральскія пагоны.

А яшчэ ты атрымоўваеш медаль "Генералу 5 класа"

**V.Вынік.**

_Якія практычныя навыкі ты замацоўваў на ўроку?

_Я множыў , дзяліў ,рашаў задачы.

Так. І ўсе нашыя заданні прадугледжвалі множанне і дзяленне дзясяткаў на адназначны лік.

Рэфлексія.

Падыйдзі да дошкі і прадоўжы фразу так,як ты лічыш будзе для цябе правільным:

**УРОК ДЛЯ МЯНЕ ПРАЙШОЎ…** **ДАРЭМНА**

**ЦІКАВА І ЗМЯСТОЎНА**

**НЕ ЦІКАВА**

**-Ты ,Валера,з'яўляешся маленькім абаронцам Айчыны і павінен імкнуцца стаць смелым,рашучым,дысцыплінаваным,добра вучыцца.Што ты абяцаеш?**

*Мы дзеці сваёй беларускай зямлі,*
*Мы хочам зямлю даглядаць,засяваць*
*Мы хочам свае гарады будаваць.*
*Мы хочам ,каб кожны ў радасці жыў,*
*Каб кожны дзяцей гадаваў і вучыў.*
*Мы клічам па свеце з'яднацца сяброў,*
*Каб полымя бойні не ўспыхнула зноў.*

**Адзнака за ўрок**

**Дамашняе заданне на картачцы**

**Сюрпрыз для гасцей**